Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне ВНУ Рэспублікі Беларусь
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра
адукацыі Рэспублікі Беларусь
__________________ А.І.Жук
“_____” ______________2010 г.
Рэгістрацыйны № ТД -____/ тып.

# СОЛЬНЫЯ СПЕВЫ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці*
*1-16 01 10 Спевы (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)*

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
навучальных устаноў і кадраў
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
________________ Н.Ю.Шмакава
“___” ________________ 2010 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай
і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ Ю.І.Міксюк
“___” ________________ 2010 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання вышэйшых навучальных
устаноў Рэспублікі Беларусь па
адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў
________________ Б.У.Святлоў
“___” ________________ 2010 г.

Рэктар дзяржаўнай установы
адукацыі “Рэспубліканскі
інстытут вышэйшай школы”
_______________ М.І.Дзямчук
“___” ________________ 2010 г.

Эксперт-нормакантралёр
______________________
“___” ________________ 2010 г.

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*І.М.Грамовіч,* дацэнт кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* харавога дырыжыравання музычна-педагагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка";

*А.І.Смагін,* прафесар кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі "Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава", доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 2 ад 04.10.2008 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 2 ад 11.11.2008 г.);

*навукова-метадычным* саветам па мастацтве музыкі Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 3 ад 16.12.2008 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *І.М.Грамовіч*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Сольныя спевы” займае важнае месца ў комплексе прафілюючых дысцыплін спецыяльнасці “Спевы (па напрамках)”, напрамку спецыяльнасці “Спевы (народныя)”. Выканаўца народнай песні павінен валодаць манерай спеваў, блізкай да носьбітаў песеннага фальклору; творча падыходзіць да вырашэння важнай праблемы сучаснасці па захаванні, развіцці і прапагандзе прагрэсіўных традыцый народна-песеннага выканаўства; садзейнічаць павышэнню ўзроўню вакальна-выканальніцкага майстэрства. Вучэбны працэс па дысцыпліне “Сольныя спевы” прадугледжвае заняткі па выканальніцкім майстэрстве, аранжыроўцы і расшыфроўцы народнай песні, асновах сцэнічнага руху, акцёрскім майстэрстве, методыцы выкладання сольных спеваў, гісторыі вакальнага мастацтва, беларускай народна-песеннай творчасці.

Навучанне народным спевам дае студэнтам неабходныя веды і ўменні, якія дапамагаюць ім авалодаць сваёй прафесіяй. Яно складаецца з практычнай, тэарэтычнай частак, а таксама кіруемай самастойнай работы. Выкладчык павінен даць студэнтам тэарэтычныя веды аб рабоце галасавога апарату, прафілактыцы і абароне голасу ад захворванняў, аб прынцыпах падбору рэпертуару з улікам індывідуальных асаблівасцей спевака, пазнаёміць з метадычнымі ўстаноўкамі пры навучанні спевам. Асноўныя тэарэтычныя палажэнні тлумачацца падчас практычных заняткаў і замацоўваюцца працай над практыкаваннямі і песеннымі творамі.

*Мэты дысцыпліны “Сольныя спевы”:*

– засваенне практычных навыкаў сольных спеваў у беларускай народнай манеры выканання;

– азнаямленне з песеннымі традыцыямі розных рэгіёнаў Беларусі;

– авалоданне акцёрскім майстэрствам і элементамі народнай харэаграфіі;

– фарміраванне музычнага густу і творчага падыходу ў стварэнні мастацкага вобраза народнай песні;

– выхаванне творчай асобы.

*Асноўныя задачы дысцыпліны:*

– вырашэнне пытанняў ідэйна-выхаваўчай работы (эстэтычнае, маральнае, патрыятычнае выхаванне студэнтаў);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– прафесійнае авалоданне тэхналогіяй спеваў у народнай манеры;

– засваенне методыкі навучання народным спевам.

Практычнае авалоданне асаблівасцямі народнага выканаўства ажыццяўляецца на аснове вывучэння беларускага песеннага фальклору, апрацовак народных песень, арыгінальных (аўтарскіх) твораў, напісаных з улікам народна-песенных выканальніцкіх традыцый, і мае творчы, імправізацыйны характар. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на спосаб гукавядзення, рэгіянальныя гаворкі, выканальніцкія прыёмы (гульня словам і гукам у народных выканаўцаў, спосабы перадачы мелізмаў, гукавых скатаў на заканчэнні фраз, агласоўка зычных і інш.), сродкі выразнасці (інтанацыйныя, тэмбравыя, дынамічныя). Засваенне народна-выканальніцкіх прыёмаў мае пераймальны характар, таму неабходна звяртацца да духоўных вытокаў, якія трэба асэнсаваць, выкарыстоўваючы мастацкае ўяўленне. Тое ж тычыцца і рэгіянальных гаворак, асаблівасці якіх уплываюць на народную манеру выканання. Сапраўднасць народна-песеннага выканаўства – гэта перш-наперш праўдзівасць пачуццяў выканаўцы.

Пасля вывучэння дысцыпліны “Сольныя спевы” выпускнік павінен *ведаць:*

– спецыфіку народнага голасу;

– народна-выканальніцкія прыёмы;

– тэхналогію засваення народнай манеры спеваў;

– стылявыя асаблівасці народнай песні розных рэгіёнаў Беларусі;

– каляндарна-абрадавы песенны цыкл Беларусі.

Выпускнік павінен *умець:*

– самастойна вывучыць і змястоўна данесці да слухача народны твор;

– свабодна валодаць народнай манерай спеваў;

– выконваць творы з суправаджэннем і а капэла;

– валодаць прынцыпамі падбору рэпертуару;

– з акцёрскім майстэрствам перадаць сэнс выконваемага твора;

– валодаць нюансіроўкай і фразіроўкай.

Асноўная форма навучання – індывідуальная. На такіх занятках фарміруецца выканальніцкае майстэрства будучага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяліста. Праверка дамашніх заданняў, пастаянны кантроль за развіццём студэнтаў-спевакоў, правільны змест дамашніх заданняў ствараюць умовы для мэтанакіраванага і бесперапыннага працэсу навучання. Паступовае і паслядоўнае навучанне студэнтаў на разнастайным музычна-стылістычным матэрыяле садзейнічае развіццю іх музычнага кругагляду, выхаванню мастацкага густу, пашырае дыяпазон выканальніцкага майстэрства.

Асноўнымі формамі кантролю з’яўляюцца экзамены і залікі пасля кожнага семестра. На працягу навучальнага года студэнт павінен вывучыць дзесяць песень, па пяць у семестры. Праграма павінна складацца з трох рознахарактарных твораў: народнай песні без суправаджэння, апрацоўкі народнай песні і аўтарскай песні, напісанай для народнага голасу.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны адведзена ўсяго 1150 гадзін, з іх 524 гадзіны - аўдыторныя заняткі (індывідуальныя).

Курс навучання сольным спевам разлічаны на пяць гадоў і яго рэкамендавана заканчваць дзяржаўным экзаменам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Аўд. (інд.) зан. |
|---|---|
| **Раздзел I. Развіццё практычных навыкаў сольных спеваў у народнай манеры** | |
| ***Тэма 1.*** Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных даных, індывідуальных недахопаў | 2 |
| ***Тэма 2.*** Набыццё навыкаў правільнага песеннага дыхання | 30 |
| ***Тэма 3.*** Развіццё практычных навыкаў спеваў | 104 |
| **Раздзел II. Засваенне тэхнікі сольных спеваў і вакальнага майстэрства** | |
| ***Тэма 1.*** Развіццё груднога рэзаніравання | 6 |
| ***Тэма 2.*** Паступовае развіццё і пашырэнне дыяпазону | 18 |
| ***Тэма 3.*** Вызваленне галасавога апарату ад напружанага гучання | 18 |
| ***Тэма 4.*** Удасканальванне дыкцыі, праца над словам | 26 |
| ***Тэма 5.*** Авалоданне народна-выканальніцкімі прыёмамі | 34 |
| **Раздзел III. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў гукаўтварэння** | |
| ***Тэма 1.*** Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу | 36 |
| ***Тэма 2.*** Развіццё і пашырэнне дыяпазону | 18 |
| ***Тэма 3.*** Засваенне асаблівасцей дыялектаў | 18 |
| ***Тэма 4.*** Знаёмства з характэрнымі прыёмамі гукаўтварэння | 30 |
| **Раздзел IV. Развіццё і ўдасканаленне вакальнай тэхнікі** | |
| ***Тэма 1***. Удасканаленне вакальнай тэхнікі | 26 |
| ***Тэма 2.*** Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці | 30 |
| ***Тэма 3.*** Праца над стварэннем мастацкага вобраза народнай песні | 35 |
| ***Тэма 4.*** Выяўленне творчай індывідуальнасці выканаўцы | 16 |
| **Раздзел V. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака – выканаўцы народнай песні** | |
| ***Тэма 1.*** Фарміраванне артыста-спевака ў межах ВНУ | 18 |
| ***Тэма 2.*** Удасканаленне вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў | 28 |
| ***Тэма 3.*** Падбор складанага і разнастайнага рэпертуару. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену | 30 |
| Усяго... | 524 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел I. Развіццё практычных навыкаў сольных спеваў у народнай манеры

### *Тэма 1. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных даных, індывідуальных недахопаў*

Замацаванне песеннай устаноўкі і развіццё правільных навыкаў спеваў: мяккай атакі гуку, плаўнага і роўнага гукавядзення, дакладнай перадачы мелодыі (рытму, вышыні гуку, фразіроўкі, эканомнай артыкуляцыі, натуральнага вымаўлення слоў).

### *Тэма 2. Набыццё навыкаў правільнага песеннага дыхання*

Дыханне песеннае і фізіялагічнае: агульныя рысы і адрозненне. Засваенне апоры дыхання. Развіццё навыкаў апоры гуку. Авалодванне рознымі тыпамі дыхання. Ніжнярэберна-дыяфрагматычны тып дыхання. Практыкаванні, якія садзейнічаюць умацаванню дыхальных мышцаў.

### *Тэма 3. Развіццё практычных навыкаў спеваў*

Выпрацоўка чыстай інтанацыі. Засваенне роўнага і плаўнага гукавядзення на невялікім дыяпазоне. Выпрацоўка навыкаў спеваў у народнай манеры ў межах квінты, сексты, сэптымы для жаночых галасоў; у межах сэптымы, актавы для мужчынскіх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Засваенне тэхнікі сольных спеваў і вакальнага майстэрства

### *Тэма 1. Развіццё груднога рэзаніравання*

Знаёмства з рэгістрамі голасу. Засваенне прыёмаў спеваў “адкрытым” гукам. Праца над высокай пазіцыяй гуку; удасканаленне працы над дыханнем і плаўным гукавядзеннем. Выкарыстанне практыкаванняў на развіццё груднога рэзаніравання.

### *Тэма 2. Паступовае развіццё і пашырэнне дыяпазону*

Авалодванне рэгістравымі пераходамі. Ускладненне вакальных практыкаванняў (папеўкі больш шырокага дыяпазону, скачкі, розныя рытмічныя малюнкі, складаныя групоўкі нот, спалучэнні гукаў і складоў).

### *Тэма 3. Вызваленне галасавога апарату ад напружанага гучання*

Фарміраванне свабодных рухаў ніжняй сківіцы. Атака гуку. Тры тыпы атакі гуку. Засваенне мяккай, цвёрдай і прыдыхальнай атак гуку.

### *Тэма 4. Удасканальванне дыкцыі, праца над словам*

Знаёмства з асаблівасцямі вымаўлення галосных і зычных гукаў у спевах. Артыкуляцыйны апарат. Авалодванне свабоднай працай артыкуляцыйнага апарату. Фарміраванне дакладнай дыкцыі. Знаёмства з тэхналогіяй вымаўлення галосных і зычных гукаў у дыялектах розных рэгіёнаў Беларусі.

### *Тэма 5. Авалоданне народна-выканальніцкімі прыёмамі*

Засваенне элементаў пластыкі, гульні. Уключэнне ў рэпертуар народных песень розных рэгіёнаў Беларусі з мэтай авалодання рэгіянальнымі выканальніцкімі прыёмамі (народныя мелізмы, спады голасу, агласоўка зычных, слізганні, глісанда і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў гукаўтварэння

### *Тэма 1. Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу*

Засваенне тэхналагічных прыёмаў развіцця дыяпазону. Удасканаленне вакальнай тэхнікі пры дапамозе практыкаванняў па выраўноўванні галосных па ўсім дыяпазоне,

развіцці гібкасці і рухомасці голасу. Спевы складаных практыкаванняў для развіцця вакальнай тэхнікі.

### *Тэма 2. Развіццё і пашырэнне дыяпазону*

Выкарыстанне спецыяльных практыкаванняў на рухомасць голасу ў шырокім дыяпазоне, хуткім тэмпе, з вялікімі скачкамі як уніз, так і ўверх. Авалоданне галаўным і грудным рэзаніраваннем, навыкамі аб'яднання іх дыханнем у працэсе спеваў. Вызваленне пеўчага апарату ад напружанасці. Ліквідацыя недахопаў гукаўтварэння.

### *Тэма 3. Засваенне асаблівасцей дыялектаў*

Авалодванне спецыфікай вымаўлення. Перайманне народна-выканальніцкіх прыёмаў. Асаблівасці рэгіянальных гаворак, стыляў і азнаямленне з імі.

### *Тэма 4. Знаёмства з характэрнымі прыёмамі гукаўтварэння*

Авалодванне метадамі народнага выканаўства. Засваенне ўсіх відаў атак: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Праца над мастацкім вобразам.

## Раздзел IV. Развіццё і ўдасканаленне вакальнай тэхнікі

### *Тэма 1. Удасканаленне вакальнай тэхнікі*

Пашырэнне дыяпазону, згладжванне рэгістравых пераходаў, развіццё груднога і галаўнога рэзаніравання. Выкарыстанне прыёмаў прыкрыцця гуку на верхніх нотах дыяпазону. Выкананне твораў у нюансах фортэ і піяна з улікам унутры іх дынамікі ў павольным, памераным, памерана-хуткім і хуткім тэмпах, уменне філіраваць гук. Удасканаленне дыкцыі і артыкуляцыі, апоры дыхання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці*

Праца над фразіроўкай, філіроўкай гуку. Выкарыстанне сродкаў мастацкай выразнасці (дынамічных адценняў, нюансаў, тэмпу і інш.) для перадачы зместу выконваемага твора. Вакальна-выканальніцкі аналіз выконваемых твораў.

### *Тэма 3. Праца над стварэннем мастацкага вобраза народнай песні*

Засваенне навыкаў імправізацыі. Выкарыстанне спецыфічных метадаў і кірункаў у інтэрпрэтацыі народнай песні. Пашырэнне дыяпазону груднога гучання ў межах сэптымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў; ужыванне складаных практыкаванняў для развіцця дыяпазону, рухомасці голасу, палётнасці, яскравасці.

### *Тэма 4. Выяўленне творчай індывідуальнасці выканаўцы*

Арганізацыя самастойнай работы спевака па падборы рэпертуару, стварэнні канцэртнай праграмы. Удасканаленне выканальніцкага і акцёрскага майстэрства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел V. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака – выканаўцы народнай песні

### *Тэма 1. Фарміраванне артыста-спевака ў межах ВНУ*

Выхаванне творчай асобы выканаўцы народнай песні і яго ідэйна-мастацкага вобраза. Засваенне прыёмаў вакальна-выканальніцкай тэхнікі, паглыбленне ведаў у сферы народнапесеннага выканаўства.

### *Тэма 2. Удасканаленне вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў*

Спевы складаных практыкаванняў на дыкцыю, дыханне, развіццё дыяпазону, рухомасць голасу. Пошук свайго выканальніцкага крэда. Удасканаленне вакальнай тэхнікі. Асэнса-

ванасць інтанавання музычна-паэтычнага тэксту, выразнасці і вобразнасці выканання.

### *Тэма 3. Падбор складанага і разнастайнага рэпертуару. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену*

Актыўная канцэртная дзейнасць. Арганізацыя самастойнай работы па стварэнні мастацкага вобраза песні, падборы рэпертуару, складанні канцэртнай праграмы. Развіццё прафесіяналізму ў народна-песенным выканаўстве.

На дзяржаўны экзамен выносяцца 10–12 твораў: народныя песні аўтэнтычныя і апрацаваныя, з суправаджэннем і без суправаджэння, арыгінальныя аўтарскія творы. Экзаменацыйная праграма павінна адпавядаць патрабаванням вучэбнага плана па падрыхтоўцы выканаўцаў народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д.Ліцвінка, Г.Д.Кутырова. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 250 с.
2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А.Захарава, Р.М.Кавалёва, В.Д.Ліцвінка. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 384 с.
3. *Беларускія* народныя танцавальныя песні: рэпертуарны зборнік / укл. М.А.Козенка. – Мн., 1988. – 112 с.
4. *Варфаламеева, Т.Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел.навука, 1980. – 220 с.
5. *Веснавыя* песні / рэд. К.П.Кабашнікаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.
6. *Вянок* беларускіх народных песень / запіс У.Раговіча. – Мн.: Навука і тэхніка, 1988. – 432 с.
7. *Дарога* ля жыта: песні бел. кампазітараў на вершы В.А.Жуковіча / укл. В.А.Жуковіч. – Мн.: Беларусь, 2001. – 144 с.
8. *Елатов, В.И.* Песни восточно-славянской общности / В.И.Елатов. – Мн.: Наука и техника, 1977. – 245 с.
9. *Жартоўныя* песні / рэд. А.С.Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1974. – 340 с.
10. *Жніўныя* песні / рэд. А.С.Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1974. – 348 с.
11. *Кузняцоў, І.І.* Звіняць над краем песні / І.І.Кузняцоў. – Мн.: Беларусь, 1979. – 79 с.
12. *Мажэйка, З.Я.* Песні Беларускага Паазер'я / З.Я.Мажэйка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1981. – 493 с.
13. *Мажэйка, З.Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я.Мажэйка, Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука,1999. – 276 с.
14. *Можейко, З.Я.* Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 184 с.
15. *Можейко, З.Я.* Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов. композитор, 1984. – Вып. 2. – 181 с.
16. *Песні* Беласточчыны / А.С.Фядосік. – Мн.: Бел. навука, 1997. – 237 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Раговіч, У.І.* Песенны фальклор Палесся. Песні святочнага календара / У.І.Раговіч. – Мн.: Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1. – 526 с.

*18. Русские* песни из репертуара Л.Руслановой. – М.: Музыка, 1973. – 95 с.

*19. Салавей* спявае / укл. С.К.Ярохіна. – Мн.: Беларусь, 1990. – 160 с.

*20. Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б.Варфаламеева, В.І.Басько, М.А.Козенка [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.

*21. У карагодзе* мы былі. Беларускія народныя танцавальныя песні / укл. М.А.Козенка. – Мн., 1988. – 112 с.

*22. Холупава, Л.І.* Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам. / Л.І.Холупава, І.М.Грамовіч, Л.Л.Ражкова. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 189 с.

*Дадатковая*

*1. Варфоломеева, Т.Б.* Северобелорусская свадьба / Т.Б.Варфоломеева. – Мн.: Наука и техника, 1988. – 154 с.

*2. Вяселле:* абрад / укл. К.А.Цвірка. – Мн.: Бел. навука. – 2004. – 683 с.

*3. Дмитриев, Л.Б.* Основы вокальной методики / Л.Б.Дмитриев. – М.: Музыка, 2000. – 367 с.

*4. Елатов, В.И.* Песни восточно-славянской общности / В.И.Елатов. – Мн.: Наука и техника, 1977. – 245 с.

*5. Емельянов, В.В.* Развитие голоса. Координация и тренаж / В.В.Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 192 с.

*6. Калугина, Н.В.* Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. вузов / Н.В.Калугина. – М.: Музыка, 1977. – С. 71.

*7. Крывіцкі, А.А.* Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / А.А.Крывіцкі. – Мн.: Т-ва па распаўсюджанні паліт. і навук. ведаў БССР, 1961. – 40 с.

*8. Малышева, Н.М.* О пении / Н.М.Малышева. – М.: Сов. композитор, 1988. – 135 с.

*9. Мешко, Н.К.* Искусство народного пения: практ. рук-во и методика обучения искусству народного пения: учеб. пособие для педагогов и студентов сред. и высш. учеб. заведений, руководителей и артистов народных хоров и ансамблей / Н.К.Мешко. – М., 2000. – Вып. 2. – С. 8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Мешко, Н.К.* Искусство народного пения: практ. рук-во и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко. – М.: ЛУЧ, 2000. – Ч. 2. – 80 с.

*11. Руднева, А.В.* Русский народный хор и работа с ним / А.В.Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. – С. 49.

*12. Савельева, В.П.* Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В.П.Савельева // Вопросы хорового образования: сб. тр.; М-во культуры РСФСР. – М.: Гос. муз.-пед. ин-т, 1985. – Вып. 77. – С. 120.

*13. Шамина, Л.В.* Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л.В.Шамина. – М.: Музыка, 1983. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СОЛЬНЫЯ СПЕВЫ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці*
*1-16 01 10 Спевы (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)*

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат $60\times84^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,9. Ул.-выд. арк. 0,47.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ